ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.10.2024 № 451

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі»
для атрымання агульнай вышэйшай
і спецыяльнай вышэйшай адукацыі,
2025 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» прызначана для асоб, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

Праграма складзена ў адпаведнасці са зместам вучэбных праграм па гісторыі Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Паказчыкамі ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў з’яўляюцца ўзровень засваення тэарэтычнага, фактaлагічнага, храналагічнага і картаграфічнага, а таксама метадалагічнага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў і адпаведных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

Абітурыент павінен в е д а ц ь:

асноўны тэарэтычны і фактaлагічны матэрыял па гісторыі Беларусі са старажытных часоў па 2024 год;

асаблівасці дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, геапалітычнага, этна-канфесійнага развіцця беларускага народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры;

грамадскія аб’яднанні і палітычныя партыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Абітурыент павінен у м е ц ь:

вызначаць храналагічную паслядоўнасць гістарычных падзей і працэсаў, іх працягласць;

суадносіць гістарычныя з’явы і працэсы гісторыі Беларусі з агульнаеўрапейскімі;

лакалізаваць на картасхеме гістарычныя падзеі, з’явы і працэсы;

адрозніваць гістарычныя і нацыянальныя формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі;

характарызаваць грамадска-палітычнае, эканамічнае, геапалітычнае, культурнае развіццё Беларусі на розных этапах гістарычнага развіцця;

характарызаваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры;

устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі, з'явамі і працэсамі;

сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты;

параўноўваць гістарычныя факты, з'явы і працэсы;

суадносіць адзін з другім розныя пункты гледжання адносна адных і тых жа гістарычных фактаў, з'яў і працэсаў;

канкрэтызаваць тэарэтычныя вывады і змест гістарычных паняццяў;

праводзіць аналіз зместу розных гістарычных крыніц;

суадносіць тэкставую і візуальную інфармацыю.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ СА СТАРАЖЫТНЫХ ЧАСОЎ ДА СЯРЭДЗІНЫ XIII ст.

*Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі ў перыяды каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.* Засяленне тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі. Заняткі і лад жыцця старажытных людзей у каменным веку. Спажывецкая гаспадарка. Супольнасці людзей каменнага веку. Рассяленне на тэрыторыі Беларусі індаеўрапейцаў. Неалітычная рэвалюцыя і яе наступствы. Першыя прылады працы з металу. Насельніцтва Беларусі ў бронзавым веку. Пачатак жалезнага веку на беларускіх землях. Здабыча жалеза. Наступствы выкарыстання металаў. Узнікненне маёмаснай няроўнасці і сацыяльнага расслаення. Будаўніцтва гарадзішчаў. Плямёны балтаў: лад жыцця, асноўныя заняткі. Эвалюцыя першабытнай абшчыны: родавая абшчына, суседская абшчына. Племя. Формы рэлігійных уяўленняў у першабытным грамадстве. Міфалогія. Першабытнае мастацтва.

*Насельніцтва беларускіх зямель у Раннім сярэднявеччы.* Балты на тэрыторыі Беларусі. Рассяленне славян на беларускіх землях. Славяна-балцкае ўзаемадзеянне. Славянскія саюзы плямёнаў на беларускіх землях: крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы. Племянныя княжанні. Князь і ваенная сіла. Веча. Заняткі старажытных славян. Язычніцкія вераванні. Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры.

*Дзяржаўнасць усходніх славян. Княствы на тэрыторыі Беларусі.* Перадумовы ўзнікнення дзяржаўнасці. Беларускія землі у складзе Старажытнай Русі. Полацкае княства ў X–XI стст. Полацкая княжацкая дынастыя. Узаемаадносіны Полацка з Ноўгарадам і Кіевам. Бітва на р.

Нямізе. Князь Усяслаў Брачыславіч. Тураўскае княства. Раздробленасць Полацкай і Тураўскай зямель у XII – першай палове XIII ст.: прычыны і вынікі. Воласці і княствы Полацкай зямлі. Часовае ўзвышэнне Мінскага княства. Адносіны паміж Полацкам і Кіевам. Веча ў Полацкай зямлі. Тураўская зямля ў перыяд раздробленасці. Княствы Панямоння, Пабужжа і Пасожжа. Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст.* Гаспадарчыя заняткі і штодзённае жыццё насельніцтва. Абавязкі насельніцтва: даніна і палюддзе. Складванне феадальных адносін. Шматукладная гаспадарка ўсходніх славян. Узнікненне і рост гарадоў. Рамесная вытворчасць і гандаль. Значэнне гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі».

*Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства.* Асаблівасці язычніцкага светапогляду. Прычыны прыняцця і працэс распаўсюджвання хрысціянства. Двухвер'е. Вынікі і значэнне прыняцця хрысціянства. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы: Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі.

*Культура беларускіх зямель у IX – сярэдзіне XIII ст.*

Пісьменнасць і літаратура. Забудова гарадоў. Царкоўнае і абарончае дойлідства. Полацкая і гродзенская архітэктурныя школы. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

## 2. БЕЛАРУСКІЯ ЗЯМЛІ
## Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

*Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ).* Перадумовы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага як поліэтнічнай дзяржавы. Міндоўг – першы кіраўнік новай дзяржавы. Дзейнасць першых вялікіх князёў па фарміраванні тэрыторыі ВКЛ.

*Унутрыпалітычная абстаноўка і знешняя палітыка ВКЛ у канцы XIII – 70-я гг. XIV ст.* Умацаванне ўлады вялікіх князёў літоўскіх. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ. Княжанне Гедыміна і Альгерда. Барацьба з агрэсіяй крыжакоў. Стараста Давід Гарадзенскі, князь Андрэй Полацкі.

*Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XIV – XV ст.: унутраная і знешняя палітыка.* Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне. Прычыны збліжэння ВКЛ і Польшчы. Крэўская унія: умовы і наступствы. Знешняя і ўнутраная палітыка Вітаўта. Узмацненне знешняй небяспекі. Грунвальдская бітва: вынікі і гістарычнае значэнне. Супярэчнасці паміж групоўкамі феадалаў у ВКЛ. Грамадзянская вайна 1432 – 1439 гг. Змена дынастыі ў ВКЛ. Казімір Ягайлавіч і яго палітыка. Знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XV ст. і яе асаблівасці.

*Палітычнае становішча ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст.* Узаемаадносіны з Польшчай і адстойванне ВКЛ дзяржаўнага суверэнітэту. Унутрыпалітычная сітуацыя. Мяцеж Міхаіла Глінскага. Барацьба з Вялікім Княствам Маскоўскім. Абарона ад набегаў крымскіх татар.

*Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання ў ВКЛ.* Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Дзяржаўны лад. Сістэма кіравання дзяржавай. Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ. Мясцовыя органы ўлады. Абмежаванне ўлады вялікага князя. Узрастанне ролі Паноў-Рады і сойма. Арганізацыя войска. Судовая сістэма і заканадаўства ВКЛ.

*Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ў ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст.* Развіццё сельскай гаспадаркі. Промыслы. Пазямельныя адносіны ў ВКЛ. Сялянскія павіннасці. Этапы запрыгоньвання сялянства. Развіццё гарадоў і мястэчак. Магдэбургскае права. Рамяство і гандаль. Станы-саслоўі феадальнага грамадства: шляхта, духавенства, мяшчане, сяляне.

*Фарміраванне беларускай народнасці.* Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя перадумовы фарміравання беларускай народнасці. Асаблівасці фарміравання беларускай народнасці. Складванне этнічнай тэрыторыі і агульнай мовы беларускага этнасу. Паходжанне назвы «Белая Русь». Этнічныя меншасці ў ВКЛ.

*Рэлігійнае жыццё на беларускіх землях у другой палове XIII – першай палове XVI ст.* Пачатак распаўсюджвання каталіцтва. Палажэнне Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла на беларускіх землях. Змяненне рэлігійнай палітыкі ў Вялікім Княстве Літоўскім пасля заключэння Крэўскай уніі. Нехрысціянскія рэлігіі.

*Культура Беларусі ў другой палове XIII – першай палове XVI ст.* Архітэктура. Асноўныя мастацкія стылі. Беларуская готыка. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Асаблівасці культуры эпохі Адраджэння (Рэнесансу) на беларускіх землях. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, гуманіст і асветнік. Літаратура. Мікола Гусоўскі.

## 3. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – XVIII ст.

*Утварэнне Рэчы Паспалітай. Становішча ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.* Перадумовы і прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сойм. Умовы аб’яднання Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Дзяржаўны лад і органы кіравання Рэчы Паспалітай. Адстойванне дзяржаўнай самастойнасці Вялікага Княства Літоўскага: распрацоўка Статута 1588 г., стварэнне Галоўнага трыбунала ВКЛ.

*Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай і яе падзелы.* Перадумовы заняпаду Рэчы Паспалітай. Унутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVII – першай палове XVIII ст.

Умяшальніцтва замежных дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. «Нямы» сойм 1717 г. Нарастанне расійскага ўплыву. Крызіс выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады. Праблема дысідэнтаў у Рэчы Паспалітай. Барская канфедэрацыя. Першы падзел Рэчы Паспалітай (1772 г.). Спробы палітычнага рэфармавання Рэчы Паспалітай. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай (1793 г.). Паўстанне 1794 г: прычыны, вынікі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795 г.).

*Знешняя палітыка ВКЛ і Рэчы Паспалітай у сярэдзіне XVI - першай палове XVII ст.* Прычыны і пачатак Лівонскай вайны. Страта Полацка. Ход вайны ў 1564 – 1570 гг. Паходы Стэфана Баторыя. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага перамір'я (1582 г.). Барацьба са Швецыяй. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву. Смаленская вайна 1632 – 1634 гг.

*Беларусь падчас войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.* Казацка-сялянская вайна 1648 – 1651 гг. на беларускіх землях. Паўстанне Багдана Хмяльніцкага і яго ўплыў на беларускія землі. Барацьба з казацкімі «загонамі». Бітвы пад Лоевам 1649 г. і 1651 г. Вынікі і наступствы вайны для Беларусі. Прычыны і пачатак вайны Расіі і Рэчы Паспалітай 1654 – 1667 гг. Вайна са Швецыяй і Кейданская унія 1655 г. Андросаўскае перамір'е 1667 г. і завяршэнне вайны. Паўночная вайна 1700 – 1721 гг. Бітвы пры Галоўчыне і Лясной (1708 г.). Вынікі і наступствы вайны для Беларусі.

*Сельская гаспадарка і гарадское жыццё ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVI – першай палове XVII ст.* Перадумовы і асаблівасці станаўлення фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Аграрная рэформа 1557 г. Афармленне прыгоннага права. Павіннасці сялян. Гарады і мястэчкі. Рамяство. Цэхі і гільдыі. Унутраны і знешні гандаль. Сацыяльныя канфлікты.

*Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.* Эканамічны заняпад у другой палове XVII – пачатку XVIII ст. Аднаўленне і развіццё гаспадаркі. Сельская гаспадарка. Формы сацыяльнай барацьбы сялянства. Развіццё гарадоў і мястэчак. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці. Пачатак эканамічных рэформ. Рэформы А.Тызенгаўза. Магнацкае прадпрымальніцтва.

*Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI – XVIII стст.* Перадумовы рэфармацыйнага руху. Пачатак рэфармацыйнага руху. Асаблівасці Рэфармацыі на беларускіх землях і яе асноўныя кірункі. Дзеячы Рэфармацыі: Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі. Вынікі Рэфармацыі. Контррэфармацыя. Дзейнасць ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. Заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі

(1596 г.): прычыны і ўмовы. Распаўсюджванне ўніяцтва. Вынікі і наступствы заключэння уніі. Дысідэнцкае пытанне ў Рэчы Паспалітай.

*Адукацыя і навука Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст.* Станаўленне сістэмы адукацыі. Віленская езуіцкая акадэмія. Грамадска-палітычная думка. К. Лышчынскі. Уплыў Асветніцтва ў Беларусі (І. Храптовіч). Рэформы Адукацыйнай камісіі у другой палове XVIII ст. Развіццё навукі (К. Семяновіч, І. Капіевіч, М. Пачобут-Адляніцкі, А. Нарушэвіч).

*Культура Беларусі ў другой палове XVI – XVIII ст.* Літаратура і кнігадрукаванне. Сімяон Полацкі. Барока ў архітэктуры і мастацтве. Выяўленчае мастацтва Тэатр і музыка. Палацава-паркавыя комплексы.

## 4. БЕЛАРУСЬ У XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*Грамадска-палітычная абстаноўка ў Беларусі ў першай палове XIX ст.* Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель Саслоўная палітыка царскага ўрада. Сацыяльна-эканамічныя змены. Абмежавальныя законы ў дачыненні да яўрэяў. Стварэнне і дзейнасць тайных арганізацый у Віленскім універсітэце і на тэрыторыі Беларусі: філаматы і філарэты, дзекабрысты, Таварыства ваенных сяброў. Прычыны, ход і вынікі паўстання 1830–1831 гг. на беларускіх землях. Змяненні ў палітыцы самадзяржаўя пасля паўстання. Грамадскі рух у 1830–1840-я гг.

*Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX – пачатку XX ст. у Беларусі.* Паўстанне 1863 – 1864 гг. «Чырвоныя» і «белыя». «Мужыцкая праўда». Вынікі паўстання для Беларусі. Сітуацыя ў беларускіх губернях пасля паўстання 1863–1864 гг. Рэвалюцыйныя народнікі. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Распаўсюджанне ідэй марксізма. Утварэнне БСГ і яе праграмныя патрабаванні. Беларусь у перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. і яго наступствы для Беларусі. Дзейнасць палітычных партый і рухаў. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у Дзяржаўнай думе. Газета «Наша Ніва». Палітыка самадзяржаўя пасля паражэння рэвалюцыі 1905–1907 гг.. Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі. Звяржэнне самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст.* Новыя з’явы ў развіцці сельскай гаспадаркі. Становішча сялян і іх павіннасці. Рэформа П.Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы. Інвентарная рэформа. Формы прамысловай вытворчасці і пачатак прамысловага перавароту. Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў. Гарады і мястэчкі.

*Буржуазныя рэформы на беларускіх землях у другой палове XIX - пачатку XX ст.* Адмена прыгоннага права: абвяшчэнне і ўмовы вызвалення памешчыцкіх сялян. Ажыццяўленне сялянскай рэформы. Вынікі і значэнне рэформы 1861 г. Уплыў паўстання 1863 – 1864 гг. на ўмовы вызвалення сялян і асаблівасці правядзення буржуазных рэформ у Беларусі. Судовая рэформа. Гарадская рэформа. Сталыпінская аграрная рэформа: прычыны, мэты і ажыццяўленне. Увядзенне земстваў. Вынікі рэформ для Беларусі.

*Развіццё капіталізму ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.* Рост буржуазнага землеўладання і асаблівасці гэтага працэсу ў Беларусі. Становішча сялян. Пераход да прадпрымальніцкай гаспадаркі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Станаўленне фабрычнай вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці. Асаблівасці прамысловага перавароту ў Беларусі. Будаўніцтва чыгунак і іх уплыў на развіццё гаспадаркі. Працэс урбанізацыі і яго асаблівасці ў Беларусі. Змяненні ў складзе гарадскога насельніцтва. Развіццё гандлю.

*Беларусь у сістэме міжнародных адносін у XIX – пачатку XX ст.* Становішча беларускіх зямель пасля ўваходжання ў склад Расійскай імперыі. «План Агінскага». Сітуацыя ў Беларусі ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г. Палітыка французскіх улад на беларускіх землях. Характар вайны для розных пластоў насельніцтва. Вынікі вайны для Беларусі. Палажэнне Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Акупацыя заходняй часткі Беларусі германскімі войскамі. Палітыка германскіх улад. Усходняя частка Беларусі ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Бежанства.

*Фарміраванне беларускай нацыі. Эвалюцыя канфесійных адносін у XIX – пачатку XX ст.* Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі. Фарміраванне агульных нацыянальных прымет. Этнічная тэрыторыя. Нацыянальны і сацыяльны склад насельніцтва. Нацыянальная самасвядомасць. Становішча канфесій у Беларусі пасля далучэння да Расійскай імперыі. Выгнанне езуітаў і абмежаванне ўплыву каталіцтва. Скасаванне ўніяцкай царквы (1839 г.). Мерапрыемствы расійскіх улад па нацыянальна-рэлігійным пытанні ў другой палове XIX ст. Заходнерусізм. Погляды М. В. Каяловіча. Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі. Тэарэтычнае афармленне беларускай нацыянальнай ідэі студэнтамі-гамонаўцамі. Змены ў рэлігійным жыцці ў пачатку XX ст. Беларускі нацыянальны рух у гады першай расійскай рэвалюцыі 1905 – 1907 гг., Першай сусветнай вайны, Лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі.

*Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.* Змены ў сістэме адукацыі. Тыпы школ. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Станаўленне беларусазнаўства і навуковыя даследаванні Беларусі. П.Шпілеўскі, К. і

Я.Тышкевічы. Станаўленне новай беларускай мовы і літаратуры. Музыка С. Манюшкі. Жывапіс: В. Ваньковіч. Архітэктура.

*Культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.* Развіццё адукацыі. Навуковыя даследаванні пра мову, этнаграфію беларусаў, гісторыю Беларусі (І. Насовіч. Е. Раманаў, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі). Развіццё беларускай літаратурнай мовы і літаратуры (Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Пашкевіч (Цётка), Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч). Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. І. Буйніцкі. Жывапіс (К. Альхімовіч, Н. Орда, Н. Сіліквановіч, Ю. Пэн, М. Шагал, І. Рэпін). Развіццё архітэктуры.

## 5. БЕЛАРУСЬ У 1917 – 1945 гг.

*Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і ўстанаўленне савецкай улады ў Беларусі.* Пераход улады ў рукі Саветаў. Фарміраванне і дзейнасць органаў савецкай улады ў Беларусі і на Заходнім фронце. Пазіцыя Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту па пытанні беларускай дзяржаўнасці. Першыя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай сферы ва ўмовах палітыкі «ваеннага камунізму».

*Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці ў 1917 – 1920 гг.* Скліканне Усебеларускага з’езда (снежань 1917 г.), яго рашэнні і роспуск. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Дзейнасць Рады БНР. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). Д.Ф. Жылуновіч, А.Г. Чарвякоў. І Усебеларускі з’езд Саветаў (люты 1919 г.) і яго рашэнні. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (Літбел). Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ 31 ліпеня 1920 г.

*Грамадска-палітычнае жыццё Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) у 1920 – 1930-я гг.* Фарміраванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Удзел БССР ва ўтварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР. Роля Камуністычнай партыі і Саветаў у грамадска-палітычным жыцці. Палітычныя рэпрэсіі.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1918 – 1930-я гг.* Першыя пераўтварэнні ў сацыяльна-эканамічнай сферы ва ўмовах палітыкі «ваеннага камунізму». Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войн. Пераход да новай эканамічнай палітыкі (нэп). Уплыў нэпа на аднаўленне народнай гаспадаркі. Правядзенне індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР. Прычыны, асаблівасці і метады правядзення індустрыялізацыі ў БССР. Вынікі прамысловага развіцця БССР у перыяд першых пяцігодак. Прычыны, метады і асаблівасці правядзення калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР. Вынікі калгаснага будаўніцтва ў БССР у перыяд першых пяцігодак.

*Беларусь ва ўмовах заканчэння Першай сусветнай вайны. Польска-савецкая вайна.* Наступленне войскаў кайзераўскай Германіі. Брэсцкі мір і яго наступствы для Беларусі. Наступленне польскіх войскаў. Становішча Беларусі ў час польска-савецкай вайны. Рыжскі мірны дагавор і яго наступствы для Беларусі.

*Становішча Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы.* Сацыяльна-эканамічная і нацыянальная палітыка польскіх улад на захопленай тэрыторыі Заходняй Беларусі. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця беларускага насельніцтва. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і працоўны рух у Заходняй Беларусі.

*Пачатак Другой сусветнай вайны.* Пачатак Другой сусветнай вайны. Паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні.

*Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Нацысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі.* Напад Германіі на СССР. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі і іх вынікі. Гераічнасць і самаадданасць абаронцаў Айчыны. Нацысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі. Удзел беларускіх калабарацыяністаў у рэалізацыі акупацыйнай палітыкі нацыстаў на тэрыторыі Беларусі. Генацыд беларускага народа. Беларускія остарбайтары.

*Барацьба беларускага народа супраць нацысцкіх акупантаў.* Стварэнне і баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. М. Казей, Р.І. Шаршнёва, М.П. Шмыроў. Партызанскія зоны. А.П. Мамкін. «Рэйкавая вайна». Падпольная барацьба. К.С. Заслонаў, Я.У. Клумаў. Масавае супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму.

*Вызваленне БССР ад нацысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.* Пачатак вызвалення БССР. Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён». Подзвігі савецкіх воінаў. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў. І.П. Антонаў, Р.У. Дольнікаў, З.М. Тусналобава-Марчанка, А.М. Усаў. Уклад беларускага народа ў разгром нацысцкай Германіі. Захаванне гістарычнай памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Закон Рэспублікі Беларусь № 146-З ад 5 студзеня 2022 г. «Аб генацыдзе беларускага народа»

*Развіццё беларускай нацыі ва ўмовах савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.* Нацыянальнае пытанне і яго вырашэнне ў БССР. Асноўныя напрамкі і мерапрыемствы палітыкі беларусізацыі, яе вынікі і значэнне. Стаўленне Савецкай дзяржавы да рэлігіі.

*Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920–1930-я гг.* Развіццё сістэмы адукацыі ў БССР. Ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі. Развіццё навукі. Інстытут беларускай культуры. Беларуская акадэмія навук. Беларуская савецкая літаратура (Я. Купала, Я. Колас,

А. Куляшоў, М. Чарот). Станаўленне беларускага савецкага тэатра. Музыка. Зараджэнне беларускага кіно. Выяўленчае мастацтва.

*Культура Заходняй Беларусі*. Стан адукацыі ва ўмовах правядзення польскімі ўладамі палітыкі паланізацыі. Дзейнасць Таварыства беларускай школы. Б. Тарашкевіч. Літаратура. М. Танк. Жывапіс. Я. Драздовіч. Музычнае мастацтва. Архітэктура.

## 6. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х – 1980-я гг.

*Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-я гг.* Асаблівасці пасляваеннага ўнутрыпалітычнага жыцця ў БССР. Змены ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 50-х – першай палове 60 - х гг. XX ст. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. К. Мазураў, П. Машэраў. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі. Удзел насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці. Палітыка «перабудовы» ў БССР. Фарміраванне шматпартыйнасці. Узаемаадносіны ўлады і царквы.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х - 1980-я гг.* Пераадоленне наступстваў вайны ў галіне эканомікі. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Фарміраванне прамысловага комплексу ў БССР. Развіццё радыётэхнічнай, радыёэлектроннай, хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці, машынабудавання і металаапрацоўкі. Аднаўленне і развіццё сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі. Умовы і ўзровень жыцця насельніцтва. Замаруджванне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы ў 1970 – 1980-я гг. Спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця. Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для насельніцтва і гаспадаркі Беларусі.

*БССР на міжнароднай арэне ў другой палове 1940 – 1980-х гг.* Выхад БССР на міжнародную арэну, удзел у заснаванні ААН. Дзейнасць БССР у ААН. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з краінамі Савета эканамічнай узаемадапамогі.

*Развіццё беларускай савецкай культуры ў другой палове 1940-х – 1980-я гг.* Развіццё сістэмы народнай адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі (В.Ф. Купрэвіч, Я.Б. Зяльдовіч, П.В. Сухі). Літаратура (В. Быкаў У. Караткевіч, А. Адамовіч, І. Шамякін І. Мележ). Беларускі тэатр. Выяўленчае мастацтва. М.А. Савіцкі. Кіно (В.Ц. Тураў, М.М. Пташук). Музычная творчасць. У. Мулявін. Алімпійскія дасягненні беларускіх савецкіх спартсменаў.

## 7. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ У 1990-я гг. – пачатку XXI ст.

*Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.* Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г. і наданне ёй статусу канстытуцыйнага закона. Рэферэндум па пытанні захавання СССР. Белавежскія пагадненні. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. і ўвядзенне пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь – А.Р. Лукашэнка. Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.

*Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст.* Развіццё грамадска-палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне галін дзяржаўнай улады. Рэспубліканскія рэферэндумы 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г., 27 лютага 2022 г., прынятыя на іх змены і дапаўненні ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Усебеларускі народны сход – вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. Палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.* Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. Пошук шляхоў выхаду з крызісу. Распрацоўка беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, мэты і сродкі яе рэалізацыі. Дзяржаўная маладзёжная палітыка. Эканамічная інтэграцыя з Расіяй і краінамі СНД.

*Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь на рубяжы XX – XXI стст.* Прыярытэты знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць Беларусі ў ААН. Стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Развіццё інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй. Фарміраванне Еўразійскага эканамічнага саюза. Узаемаадносіны Беларусі з іншымі краінамі свету. Развіццё эканамічных і культурных сувязей з краінамі блізкага і далёкага замежжа. Развіццё сувязей з беларускай дыяспарай.

*Беларуская нацыя ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.* Развіццё сучаснай беларускай нацыі. Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі. Характарыстыкі сучаснага менталітэту беларусаў. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій.

*Развіццё адукацыі і навукі, культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь.* Афармленне дзяржаўнага статуса беларускай і рускай моў. Развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі. Літаратура. Музыка. Выяўленчае мастацтва. Тэатр і кіно. Алімпійскія дасягненні беларускіх спартсменаў.

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Закон Республики Беларусь «О геноциде белорусского народа» от 5 января 2022 г. № 146-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3961&p0=H12200146.

2. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання : у 2 ч. / Ю.М. Бохан, С.М. Цемушаў; пад рэд. Ю.М. Бохана. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2016.

3. Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.А.Варонін, А.А.Скеп’ян, А.У.Мацук, В.В. Краўчанка; пад рэд.: В.А.Вароніна, А.А.Скеп’ян. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2017.

4. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст.: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / С.В.Паноў, С.В.Марозава, У.А.Сосна; пад рэд.: У.А.Сосны. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2018.

5. Гісторыя Беларусі 1917 г. – пачатак XXI ст.: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / С.В.Паноў, У.Н.Сідарцоў, В.М.Фамін. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2019.

6. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.А.Белазаровіч, С.А.Кудраўцава, А.У.Любы; пад рэд. В.А.Белазаровіча. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2020.

7. Гісторыя Беларусі, XIX – пачатак XXI ст.: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А.В. Касовіч, Н.В. Барабаш, А.А. Корзюк, В.А. Йоцюс, П.А. Мацюш, А.П. Салаўянаў; пад рэд. А.В. Касовіча, А.П. Салаўянава. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2021;

8. Атлас. Гісторыя Белаурсі са старажытных часоў да канца XV ст.: вучэбны дапаможнік для 6 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / С.М.Цемушаў. – Мінск: Белкартаграфія, 2021.

9. Атлас. Гісторыя Беларусі, XVI – XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 7 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В.А.Варонін, А.А.Скеп’ян. – Мінск: Белкартаграфія, 2018.

10. Атлас. Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст.: вучэбны дапаможнік для 9 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А.Г.Каханоўскі, А.М.Лукашэвіч. – Мінск: Белкартаграфія, 2016.

11. Атлас. Гісторыя Беларусі, 1917 г. – пачатак XXI ст.: вучэбны дапаможнік для 9 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / У.В.Тугай, А.М.Лукашэвіч. – Мінск: Белкартаграфія, 2020.

12. Атлас. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 10 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. А. Белазаровіч, С.А. Кудраўцава. – Мінск : Белкартаграфія, 2020.

13. Атлас. Гісторыя Беларусі, XIX – пачатак XXI ст.: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А.М.Лукашэвіч. – Мінск: Белкартаграфія, 2022.